# З НОВЫМ ГОДАМ, ДАРАГІЯ СЯБРЫ!

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

№ 38 (757) Пятніца, 26 снежня 1969 г. Цана 2 кап. Год выдання XXIII



МІНСК ПЕРАДСВЯТОЧНЫ.

Фота А. Федарэнчыка.

Праз некальні дзён мы развітаемся з 1969 годам. Ён адыходзіць у гісторыю, але застэецца ў нашай памяці як год стваральнай працы, плённай падрыхтоўкі да Ленінскага юбілею, як прыкметная вяха ў развіцці нашага універсітэта.

Канец адыходзячага года адзначан шматлікімі цікавымі падзеямі. Сярод іх прыцягвае ўвагу стварэнне новых універсітэцкіх кафедр. Да ліку існуючых далучыліся яшчэ дзве — кафедра будовы рэчыва на хімічным факультэце і кафедра геадэзіі і картаграфіі на геолага-геаграфічным.

Напярэдадні Новага года наш карэспандэнт звярнуўся да загадчыкаў новых кафедр Ю. В. Глазкова і В. Я. Крышчановіча і папрасіў іх коратка расказаць аб задачах, якія стаяць перад іх калектывамі, і аб планах на будучае.

## САДРУЖНАСЦЬ ХІМІІ І ФІЗІКІ

**Ю. В. ГЛАЗКОЎ,**
**кандыдат фізіка-матэматычных навук, загадчык кафедры будовы рэчыва.**

Наша кафедра прызвана цясней звязаць хімію з фізікай. Гэта неабходна не толькі для ўдасканалення падрыхтоўкі спецыялістаў на хімічным факультэце, але і для развіцця навукі. Жыццё дыктуе неабходнасць больш шырокага прымянення ў хіміі сучасных фізічных метадаў, такіх, у прыватнасці, як радыёспектраскапія, атамная і малекулярная спектраскапія і іншыя. Канешне, і раней хімікі выкарыстоўвалі некаторыя фізічныя метады, але рабілі гэта без спецыяльнай падрыхтоўкі, недастаткова былі знаёмы з радыёспектраскапіяй. Цяпер жа гэтыя галіны развіваюцца паспяхова і эфектыўна абслугоўваюць хімічныя навукі.

Спадзяемся, пліннымі будуць і сумесныя навуковыя даследаванні: устанаўленне структуры атрымліваемых рэчываў у час рэакцый, атоесамленне тых ці іншых хімічных групіровак, выяўленне хімічных радыкалаў і ўстанаўленне іх прыроды і г. д.

**— Якое абсталяванне мае ў наяўнасці кафедра?**

— Ёсць у нас замежны радыёспектрометр ядзернага магнітнага рэзанансу, такі ж спектрометр айчыннай вытворчасці, радыёспектрометр парамагнітнага рэзанансу.

У складзе кафедры будзе 6—7 выкладчыкаў і 5—6 навуковых супрацоўнікаў.

Калектыў ужо ўключыўся ў вучэбны працэс. Дацэнт Уладзімір Сцяпанавіч Каралькоў чытае курс «Выбраныя главы тэарэтычнай фізікі», выкладчык П. В. Кузаўкоў вядзе практычныя заняткі. У нашай сферы выкладання будова рэчыва, квантавая хімія, фізічныя метады ў хіміі.

З будучага года намячаецца ўвесці спецыялізацыю студэнтаў па спектраскапіі і квантавай хіміі.

А цяпер асноўны клопат і задача — каб добра працавала кафедра.

## ЗАПАТРАБАВАННЕ ЧАСУ

**В. Я. КРЫШЧАНОВІЧ, дацэнт, загадчык кафедры геадэзіі і картаграфіі.**

Перад намі цяпер дзве асноўныя задачы: добра наладзіць вучэбны працэс і разгарнуць навукова-даследчую работу ў галіне картаграфіі. Іменна ў гэтым напрамку мы цяпер і працуем. Арганізацыйны перыяд выкарыстоўваем для абсталявання кабінетаў, знаёмства з вопытам калег. Нядаўна ўсёй кафедрай зрабілі паездку ў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. Два дні знаёміліся там з пастаноўкай работы, убачылі многа цікавага і карыснага. Сёе-тое думаем выкарыстаць у сябе. Зрабілі неабходныя заказы.

З мэтай паляпшэння выкладання падрыхтавалі да друку дапаможнік «Лабараторныя заняткі па эканамічнай картаграфіі». Да 1 лютага намячаем завяршыць работу над другім дапаможнікам вялікага аб'ёму—«Практычныя заняткі па чарчэнню і рысаванню» і выканаць свае абавязацельства ў гонар 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна. Студэнцкі калектыў прыцягваем да падрыхтоўкі наглядных дапаможнікаў.

Адна з сур'ёзных задач, якую мы цяпер вырашаем, — стварэнне пастаяннай базы для практыкі студэнтаў. Становчае яе вырашэнне дазволіць весці падрыхтоўку спецыялістаў на сучаснай навуковай аснове, з выкарыстаннем аэрафотаздымкі.

Інструментаў і абсталявання для практыкі ў нас дастаткова. Ёсць прыборы і для правядзення спецкурса, якія мы пакуль што не можам выкарыстаць з-за адсутнасці памяшкання. Але з цягам часу, думаем, будзе ў нас разам з іншымі і кабінет аэраметадаў.

Вялікія планы ў калектыва па навукова-даследчай рабоце. Цяпер, у сувязі з надыходзячым перапісам насельніцтва, вядзецца падрыхтоўка да стварэння «Дзяржаўнай карты насельніцтва СССР», і мы хочам выканаць тую частку работы з гэтай серыі, якая плануецца па Беларусі.

Навуковыя даследаванні калектыў мае намер цесна звязаць з вытворчасцю, выконваць яе заказы і заяўкі, удзельнічаць у стварэнні неабходных карт і атласаў. Такі вопыт у нас ужо ёсць.

Шырэй будзем прыцягваць да навуковай работы студэнтаў усіх курсаў. Ужо цяпер некаторыя з іх выконваюць цікавыя даследчыя работы, якія маюць вялікае вытворчае значэнне.

Стварэнне новай кафедры рэалізуе спрыяльныя магчымасці для падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў па геадэзіі і картаграфіі.



*Радасна, у адзінай сям'і моладзі, сустракаюць на беларускай зямлі навагодняе свята замежныя студэнты нашага універсітэта.*

*Фота М. НЕЧЫПАРЭНКІ.*

## Раз, два— здалі!

Залікі, залікі, залікі!.. Каму незнаёмы гэтыя студэнцкія хваляванні! І бясконцае гартанне канспекта (яшчэ раз — апошні), і гэтая дзелавая заклапочанасць.

На стол нясмела пакладзена заліковая кніжка. Якой жа рукой цягнуць білет? А, усё роўна... Пытанне... Разабраць сказ. Позірк студэнта накіроўваецца на дошку. А на ёй яшчэ ад часоў занятка́ў вельмі хвалюючы малюнак — амаль у натуральную велічыню слон.

Але ж пытанне... І хваляванне неяк знікае...

На другім курсе гістарычнага факультэта ідзе залік па стылістыцы рускай мовы. У аўдыторыі схіліліся над сталамі ў задуменні некалькі чалавек. Адказваць пачаў студэнт Н. Прыпатнёў. Ён нядрэнна займаўся на працягу семестра. Адказвае ўпаўголаса, амаль шэптам. Час ад часу і выкладчык Людміла Рыгораўна Машчэнская нягучна падае заўвагі:

— Цішэй там, дзяўчаткі. Якраз на заліку пачуццё калектывізму павінна быць як мага слабей.

І апошняе пытанне Прыпатнёву: разабраць сказ. Ён чытае: «У адным з самых паэтычных куткоў зямнога шара...» «Што такое? Якія могуць быць куткі ў шара?» — здзіўляецца студэнт.

Нарэшце ўсё вытлумачана. Усё добра. Выдатна адказвалі студэнткі Савосціна, Ганчарова. Ды і ўсе астатнія падрыхтаваліся добра.

Ну, вось, першы залік здадзен. І слон на дошцы, здаецца, таксама падзяляе радасць студэнтаў.

А наступная група другога курса ў гэты час здавала вельмі цікавы прадмет — нумізматыку. У доўгім калідоры скульптуры антычных багоў, міфічных герояў. Усе такія сур'ёзныя, нахмураныя, нібы стагоддзямі вырашаюць адну і тую ж складаную праблему. Драўляныя пастаменты іх завалены папкамі і партфелямі, кнігамі і канспектамі. Нейкі жартаўнік ужо просіць літасці ў багоў Алімпа: «О, Афрадзіта, дапамажы здаць яшчэ адзін залік!»

Глыбіня вякоў... Як выраблялі манеты ў старажытнасці? На гэтае пытанне адказвае студэнтка Драпека.

Нумізматыка — сур'ёзная галіна навукі. Чытае гэты прадмет на гістфаку Валянцін Навумавіч Рабцэвіч. Зусім нядаўна выйшла яго кніга «Аб чым расказваюць манеты». Прачытаць яе будзе цікава не толькі гісторыкам...

Вось да стала падышоў студэнт Канеўскі. Упэўнена адказвае: першы савецкі рубель адчаканен у жніўні 1921 года. Тады яшчэ былі першыя залатыя савецкія манеты...

Так незаўважальна прайшоў час, апусцеў калідор. Нязвычайная цішыня. Толькі антычныя багі і героі па-ранейшаму ў задуменні.

**В. ФЕРАНЦ, М. ШУЛЬМАН,**
студэнты.

*ТВАЕ НАСТАЎНІКІ, СТУДЭНТ*

# ШЧОДРАЙ ДУШЫ ЧАЛАВЕК

Мяне зацікавіў гэты чалавек. Яго ўменне прываблiваць да сябе, яго характар. Шчыра і цёпла адклікаюцца студэнты, калі назавеш яго прозвішча.

Аб Паўлу Паўлавічу Шубе, дацэнту кафедры рускай мовы, можна пачуць многа сардэчных слоў і ад студэнтаў, і ад аспірантаў, і ад выкладчыкаў. Любяць і паважаюць яго ўсе.

— Чаму падабаецца гэты чалавек?.. Студэнты Таццяна Музыка, Тамара Сянюта і Мікалай Антропаў на хвіліну задумваюцца, а пасля ўжо — іх не спыніць. Успамінаецца ўсё: і цікавыя лекцыі, і семінарскія заняткі, і гутаркі ў перапынках.

— Просты, добры як чалавек, як настаўнік.

З гэтымі словамі Таццяны Музыкі згаджаецца і аспірант Міхаіл Дарашэнка. Апошні добра ведае выкладчыка, не раз заслухоўваўся яго лекцыямі, гутарыў з ім. Ад яго пайшла і любоў да слова. Закончыўшы філалагічны факультэт, Міхаіл працаваў настаўнікам у школе, а пасля паступіў у аспірантуру і зноў сустрэўся са сваім выкладчыкам, піша пад яго кіраўніцтвам навуковую работу...

У аўдыторыі прыціхлі. Пачалася лекцыя.

Тэма занятка́ў — «Назоўнік». Павел Паўлавіч узяў кусочак мелу, падышоў да акна. Сыпаў снег. Чамусьці ўсплылі ў памяці родныя мясціны, вёска на Случчыне. Басаногім хлапчуком бегаў ён па сенажацях, лавіў у тарфяных канавах уюноў, захапляўся гульнямі. Але вольнага часу было мала. Трэба было дапамагаць бацькам па гаспадарцы. Рана палюбіў хлопчык кнігу. Многае для гэтага зрабіў бацька. Гэты просты чалавек здолеў перадаць сыну зацікаўленасць да роднай мовы і літаратуры. Ён добра ведаў творы Пушкіна, Лермантава, Бялінскага, чытаў напамяць амаль усяго Крылова. Часта зімовымі вечарамі ў хаце конюха наладжваліся калектыўныя чытанні. Многія з прысутных і самі спрабавалі свае сілы ў літаратуры.

Закончыўшы сем класаў, Павел у 1939 годзе паступае ў Слуцкае педвучылішча. У свае 13 год ён яшчэ шмат чаго не разумеў, але жаданне вучыцца было ўсё большым і большым.

Заняткам перашкодзіла вайна. Пайшоў у ваенкамат, каб узялі на фронт. Адказалі. Гаварылі: малы яшчэ, дома сядзі. І толькі ў 1944 годзе юнак трапіў на фронт. У студзені 1945 года першым на варожай зямлі аказаўся полк, у якім служыў Павел Паўлавіч. За баявыя подзвігі гэтаму падраздзяленню была аб'яўлена падзяка і прысвоена званне гвардзейскага. У адной з атак кулямётчык Павел Шуба атрымаў чатыры раненні. Апошнія шэсць месяцаў вайны праляжаў у шпіталі...

Пасля вайны працаваў у райкоме. Аднача́сова канчаў вучобу ў вучылішчы.

1947 год быў радасны ў жыцці Паўла Паўлавіча. Паспяхова здаўшы экзамен, ён быў залічаны ў Гродзенскі педінстытут. Студэнт адразу ж уключаецца ў навукова-даследчую і грамадскую работу. На адным з рэспубліканскіх аглядаў яго праца «Фанетычныя асаблівасці гавараў у вёсках Пухавіцкага раёна» атрымала першую катэгорыю. Гэты поспех натхніў будучага вучонага.

Закончыўшы на выдатна інстытут, Павел Паўлавіч паступіў у аспірантуру, пасля заканчэння якой шэсць год працаваў у Акадэміі навук БССР. А ў 1961 годзе ўпершыню стаў за кафедру ва ўніверсітэце...

— Запісалі тэму?.. Прадоўжым.

І вось так амаль кожны дзень аддае свае веды студэнтам Павел Паўлавіч Шуба.

Член тапанімічнай камісіі пры рэспубліканскім камітэце славістаў, старшыня метадычнай камісіі па другому курсу, вучоны сакратар вучонага савета філалагічнага факультэта — гэта далёка не поўны пералік грамадскіх абавязкаў Паўла Паўлавіча. Яго ведаюць і на вучоным савеце, і на камсамольскім сходзе.

Пад кіраўніцтвам П. П. Шубы многія выхаванцы ўніверсітэта закончылі аспірантуру і паспяхова працуюць. Так, М. М. Пічанка выкладае ў нашым універсітэце, В. І. Дронь—у Варшаўскім політэхнічным інстытуце.

Вялікую навуковую работу вядзе Павел Паўлавіч. Ім падрыхтавана звыш 60 прац у галіне мовазнаўства. Удзел у выданні трохтомніка па курсу сучаснай беларускай мовы, зборніка практыкаванняў і акадэмічнай граматыкі ў трох тамах, правіл беларускай арфаграфіі і пунктуацыі і многія іншыя работы характарызуюць Паўла Паўлавіча як выдатнага даследчыка, чалавека, які захоплен сваёй справай.

На пытанне аб творчых планах на новы, 1970 год Павел Паўлавіч адказаў:

— Думаю ў новым годзе прадоўжыць працу над тэмамі «Службовыя словы ў беларускай мове», над першым раздзелам якой я працую ўжо цяпер. Недзе ў першым нумары «Весніка Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна» за 1970 год з'явіцца мой абагульняючы артыкул «Прыназоўнік» як грамадская катэгорыя». Намечана таксама перавыданне «Тлумачальнага слоўніка беларускай мовы».

Павел Паўлавіч не сказаў толькі, што цяпер рыхтуе доктарскую дысертацыю.

Хочацца, каб у новым годзе планы вучонага здзейсніліся.

**Г. ЗЯНЬКОВІЧ,**
студэнт.

Захапленне паэзіяй уласціва многім студэнтам факультэта журналістыкі, і таму тут маладыя паэты лёгка знаходзяць уважлівую і зацікаўленую аўдыторыю, а паэтычныя навінкі — шчырых паклоннікаў і крытыкаў.

Нядаўна творчая моладзь правяла пасяджэнне літаратурнага аб'яднання, на якім быў распрацаваны план, які прадугледжвае арганізацыю творчых сустрэч і выступленняў, вечароў паэзіі, абмеркаванне новых твораў.



На здымку П. КАЛЮЖНАЙ студэнты журфака У. Трусаў, В. Аўчарэнка, Н. Лось, А. Ласмінскі, А. Трызна, В. Шыханцоў абмяркоўваюць план дзейнасці творчага аб'яднання.

## ПА ПЛАНЕЦЕ КРОЧЫЦЬ НОВЫ ГОД

На розных мерыдыянах і паралелях Новы год сустракаецца па-рознаму. Але ва ўсіх народаў ён з'яўляецца самым вясёлым і жаданым святам, бо прыносіць новае шчасце, новую радасць. У новым годзе спаўняюцца задумы года старога.

31 студзеня а 12-й гадзіне ўсюды ў балгарскіх хатах на тры хвіліны гасне святло. У гэты момант па традыцыі людзі могуць цалавацца, а потым усе адведваюць навагоднія пірагі, якія заўсёды пякуць з маленькімі сюрпрызамі. Адзін знойдзе ў іх манету — значыць ён будзе багаты у новым годзе, іншы знойдзе ружу — шчаслівым будзе.

Раніцай дзеці ходзяць па хатах, віншуюць і жадаюць усім шчасця ў новым годзе. Старэйшыя ўручаюць дзецям падарункі.

У Румыніі а 12-й гадзіне ночы юнакі і дзяўчаты выходзяць на вуліцу і ідуць ад аднаго дома да другога. Ля кожнай хаты яны спяваюць песні-жарты. Людзі частуюць іх за гэта.

А вось японцы сустракаюць Новы год не ноччу, а на досвітку. Яны выходзяць на вуліцу і чакаюць ружовы ўсход сонца. Калі сонца ўзыдзе — абменьваюцца падарункамі. У руках людзі трымаюць бамбук, галінкі сасны і слівы. Гэта значыць, што яны хочуць быць дужымі і моцнымі, як бамбук, хутка расці, як сліва, жыць доўга, як сасна.

У першы дзень Новага года па вуліцах і плошчах гарадоў і сёл Гвінеі водзяць слана, вакол якога танцуюць і спяваюць вясёлыя песні... Тут лічаць, што слон—самая добрая і справядлівая жывёліна.

Напярэдадні Новага года мы звярнуліся да замежных студэнтаў нашага універсітэта з просьбай расказаць, як сустракаюць Новы год у іх краінах.

Студэнт біялагічнага факультэта Ендон Загд-Сурэн (МНР) расказаў, што сустрэча Новага года ў Манголіі вельмі падобна на сустрэчу яго ў Савецкім Саюзе.

(Заканчэнне на 4-й стар).

# ГУРТКОЎЦЫ ТРЫМАЮЦЬ СПРАВАЗДАЧУ

Звычайна падрахунак зробленаму падводзіцца ў канцы навучальнага года. Аднак і перад новым годам падводзяцца пэўныя вынікі, намячаюцца новыя рубяжы, якія неабходна адолець у новым семестры.

Літаратуразнаўчы гурток (кіраўнік — кандыдат філалагічных навук В. П. Рагойша) вось ужо амаль год працуе над сваёй генеральнай тэмай — «Універсітэт і літаратура». Гэтае гісторыка-літаратурнае даследаванне прысвячаецца 50-годдзю нашага універсітэта. Як вядома, з універсітэтам цесна звязаны імёны многіх беларускіх літаратараў. Наша альма-матэр дала пуцёўку ў свет большасці членаў сённяшняга Саюза пісьменнікаў БССР. Адным з першых дацэнтаў універсітэта з'яўляўся Якуб Колас, тут расправлялі свае крылы колішнія студэнты Кузьма Чорны, Кандрат Крапіва, Пятрусь Броўка, Пятро Глебка, Андрэй Александровіч, Максім Лужанін і многія іншыя. Вось і рашылі гурткоўцы стварыць своеасаблівы летапіс літаратурнага жыцця універсітэта за пяцьдзесят год, напісаць грунтоўную манаграфію. За кожным з іх замацавана пэўная тэма — асобны раздзел гэтай агульнай манаграфіі. На пасяджэннях гуртка робяцца рэгулярна даклады па выбранай тэме. З вялікай цікавасцю былі заслуханы выступленні В. Дашкевіча «Якуб Колас і Белдзяржуніверсітэт», Г. Каржанеўскай — «Літаратары на старонках універсітэцкіх шматтыражак». Ажыўлена прайшло абмеркаванне паведамленняў: У. Адамушкі — «Літаратурнае жыццё ва універсітэце ў даваенны час», П. Сімановіча— «Літаратурнае аб'яднанне «Узлёт» і іншыя. Усім літаратарам — былым студэнтам універсітэта—разасланы лісты з просьбай падзяліцца сваімі ўспамінамі пра навучальную ўстанову, тагачаснае літаратурнае жыццё. Ужо атрыманы некаторыя адказы, кнігі з аўтографамі. У свой час з гэтым матэрыялам пазнаёмяцца і чытачы «Беларускага універсітэта».

Але навукова-даследчая праца гурткоўцаў — не адзіная. Побач з ёй вядзецца вялікая метадычная і выхаваўчая работа. Так, адбылася цікавая сустрэча з галоўным бібліёграфам Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У. І. Леніна, заслужаным дзеячам культуры Беларусі Нінай Барысаўнай Ватацы. Гурткоўцы — актыўныя ўдзельнікі сустрэч з пісьменнікамі, дзеячамі культуры рэспублікі, частыя госці ў клубе Саюза пісьменнікаў БССР. Некаторыя з іх спрабуюць свае сілы ў галіне крытыкі, друкуюць рэцэнзіі нават на старонках рэспубліканскіх выданняў. Пераважная большасць членаў гуртка вучыцца толькі на добра і выдатна, актыўна ўдзельнічае ў грамадскай працы факультэта і універсітэта. Безумоўна, наваго́днюю справаздачу яны вытрымаюць паспяхова.

**В. НАЧАНОВІЧ.**





*НА ЗДЫМКАХ: урачысты сход, прысвечаны 9-годдзю Нацыянальнага фронту вызвалення Паўднёвага В'етнама і 25-й гадавіне В'етнамскай Народнай Арміі.*

*Фота М. НЕЧЫПАРЭНКІ.*

# ПРЫСВЕЧАНЫ В'ЕТНАМУ

*У актавай зале галоўнага корпуса універсітэта адбыўся ўрачысты сход, прысвечаны 9-годдзю Нацыянальнага фронту вызвалення Паўднёвага В'етнама і 25-й гадавіне В'етнамскай Народнай Арміі. Яго адкрыў намеснік сакратара парткома універсітэта Г. Я. Рылюк. Ад імя в'етнамскіх студэнтаў і аспірантаў навучальных устаноў беларускай сталіцы выступіў былы выпускнік фізічнага факультэта, зараз аспірант нашага універсітэта Нгуен Куанг Мінь. Ён каротка асвятліў гісторыю ўзнікнення Нацыянальнага фронту вызвалення Паўднёвага В'етнама і стварэння В'етнамскай Народнай Арміі, расказаў аб барацьбе свайго народа за свабоду і незалежнасць, выказаў падзяку савецкаму народу за падтрымку і ўсебаковую дапамогу.*

*Прадстаўнікоў гераічнага В'етнама горача віталі і віншавалі са знамянальнымі датамі намеснік загадчыка аддзела Мінскага гаркома ЛКСМБ Аўгусцін Юзафовіч, студэнт гістарычнага факультэта Васіль Кушнер, ад афрыканскіх студэнтаў—Адэогба Годвін, студэнт Беларускага політэхнічнага інстытута.*

*Днямі ў сярэдняй школе № 82 г. Мінска адбыўся вечар савецка-в'етнамскай дружбы, на які была запрошана група в'етнамскіх студэнтаў нашага універсітэта.*

*Прэзідэнт в'етнамскіх студэнтаў падрыхтоўчага факультэта Чан Ван Чыонг расказаў школьнікам аб будаўніцтве сацыялізма ў ДРВ, аб клопатах партыі працоўных В'етнама і ўрада рэспублікі аб дзецях, іх вучобе і адпачынку.*

*Студэнта III курса фізфака Хо Нгок Чыонга рабяты слухалі затаіўшы дыханне. Ён расказаў юным сябрам аб барацьбе Паўднёвага В'етнама за свабоду і незалежнасць, аб умовах, у якіх даводзіцца вучыцца паўднёва-в'етнамскім дзецям.*

*Вечар закончыўся канцэртам мастацкай самадзейнасці, у якім прынялі актыўны ўдзел в'етнамскія студэнты.*

*У. СЯРГЕЕЎ.*

*1-га СТУДЗЕНЯ СУДАНСКІ НАРОД АДЗНАЧАЕ 14-ю ГАДАВІНУ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ КРАІНЫ.*

# ПА ШЛЯХУ ДЭМАКРАТЫЧНАГА РАЗВІЦЦЯ

1 студзеня 1956 года трохкаляровы сцяг маладой рэспублікі Судан заняў сваё месца ў рэспубліканскім палацы побач са сцягамі іншых свабодных краін. Гэта азначала, што апошні замежны салдат пакінуў нашу краіну раз і назаўсёды. Аднак маладой рэспубліцы засталася цяжкая спадчына: эканамічная адсталасць, непісьменнасць большасці насельніцтва, сур'ёзныя супярэчнасці паміж поўначчу і поўднем.

Былыя каланізатары спадзяваліся на тое, што Судан, атрымаўшы палітычную незалежнасць, застанецца ў эканамічнай кабале Англіі.

Гэта палітыка знайшла сваё практычнае праяўленне ў галіне эканомікі і адукацыі. У выніку гэтага краіна 13 год ішла па капіталістычнаму шляху развіцця, які можна ахарактарызаваць, адпаведна ленінскаму вучэнню, як неакаланіялізм. «Дапамога» развітых капіталістычных краін прывяла да масавай эксплуатацыі народа амерыканскімі і англійскімі кампаніямі, якім садзейнічала нацыянальная буржуазія.

Але прагрэсіўныя сілы краіны вялі няспынную барацьбу за поўную палітычную і эканамічную незалежнасць. Да 25 мая 1969 года неаднаразова мяняўся ўрад. Значную ролю ў гісторыі краіны адыграла рэвалюцыя 21 кастрычніка 1964 года. Тады батальёнам Хартумскага гарнізона камандаваў Джафар Махамед эль-Немейры. Разам з другімі воінскімі часцямі батальён перайшоў на бок рэвалюцыі. Аднак рэакцыйныя сілы захапілі ўладу, завяяваную народам, у свае рукі. Захаваўся ранейшы рэжым.

25 мая 1969 года адбыўся прагрэсіўны рэвалюцыйны пераварот, узначалены генерал - маёрам Джафарам Махамедам эль-Немейры. У краіне быў устаноўлены новы прагрэсіўны рэжым, які атрымаў падтрымку шырокіх слаёў народа.

Узначальваемы Немейры ўрад выступае за прагрэсіўнае сацыяльна-эканамічнае пераўтварэнне ў краіне, умацаванне нацыянальнай незалежнасці, за далейшае развіццё адносін дружбы і ўсебаковага супрацоўніцтва з арабскімі і сацыялістычнымі краінамі на чале з Савецкім Саюзам. Дэмакратычная Рэспубліка Судан праводзіць антыімперыялістычную знешнюю палітыку, падтрымлівае палітыку міралюбівых народаў за захаванне міру і ўмацаванне міжнароднай бяспекі, за ліквідацыю каланіялізму ва ўсіх яго формах.

Практычным крокам здзяйснення новай знешняй палітыкі з'явілася прызнанне ГДР урадам Дэмакратычнай Рэспублікі Судан.

Па запрашэнню Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР і Савецкага ўрада ў лістападзе гэтага года ў Маскве знаходзілася дзяржаўная дэлегацыя Дэмакратычнай Рэспублікі Судан на чале са старшынёй Рэвалюцыйнага Савета, прэм'ер-міністрам і галоўнакамандуючым узброенымі сіламі генерал-маёрам Джафарам Махамедам эль-Немейры. У Маскве было падпісана пагадненне аб пашырэнні гандлёвых адносін паміж СССР і Дэмакратычнай Рэспублікай Судан.

Генерал-маёр Джафар Махамед эль-Немейры у час знаходжання ў СССР расказаў аб дасягненнях суданскага народа, які выбраў пасля рэвалюцыі 25 мая 1969 года шлях сацыялістычнага развіцця і прыступіў да будаўніцтва новага жыцця на асновах дэмакратыі і сацыяльнага прагрэсу.

Абодва бакі выказаліся за развіццё дружбы і ўсебаковага супрацоўніцтва паміж СССР і Дэмакратычнай Рэспублікай Судан у інтарэсах справы міру і сацыяльнага прагрэсу народаў.

Гэтыя падзеі маюць асабліва важнае значэнне ў сувязі з надыходзячым 100-годдзем з дня нараджэння правадыра і настаўніка пралетарыяту ўсяго свету, вялікага мысліцеля, абаронцы чалавечай годнасці У. І. Леніна. Дэмакратычная Рэспубліка Судан, як і ўсе прагрэсіўныя краіны свету, прыме практычны ўдзел у сустрэчы гэтай знамянальнай даты.

10 лістапада 1969 года у Міністэрстве замежных спраў СССР адбылося падпісанне плана культурнага і навуковага супрацоўніцтва паміж Савецкім Саюзам і Дэмакратычнай Рэспублікай Судан на 1970—1971 гады. План прадугледжвае далейшае пашырэнне ўзаемнага абмену ў галіне адукацыі, культуры, медыцыны і спорту. Было дагаворана таксама аб правядзенні раду мерапрыемстваў, прысвечаных 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна. У прыватнасці, у Судане будзе экспаніравана выстаўка «Па запаветах У. І. Леніна», праведзен фестываль савецкіх фільмаў па ленінскай тэматыцы, суданскае радыё і тэлебачанне арганізуюць серыю спецыяльных перадач.

Цяпер Судан упэўнена ідзе па шляху будаўніцтва новага жыцця на дэмакратычных пачатках.

**ШАХІН САМІР МАХАМЕД,**
**студэнт юрыдычнага факультэта БДУ.**

□ □ □





**На здымках:** прадстаўнікі Суданскага Саюза Моладзі на святочнай дэманстрацыі ў Дзень незалежнасці рэспублікі.

Адна з цэнтральных вуліц сталіцы рэспублікі Хартума.

□ □ □

# НАВАГОДНІ РЭЙД ДЗЕДА МАРОЗА

Па традыцыі перад тым, як перадаць эстафету свайму малодшаму таварышу, Стары год вырашыў яшчэ раз агледзець свае ўладанні. Ён паклікаў да сябе Дзеда Мароза і яго галоўных памочнікаў і загадаў ім абыйсці прадпрыемствы і ўстановы, паглядзець, як там рыхтуюцца да сустрэчы Новага года, якія поспехі можна адзначыць і якія недахопы трэба будзе ліквідаваць. Калі дайшла чарга да Беларускага дзяржаўнага універсітэта, Стары год папярэдзіў:

— Універсітэт за гэты год вельмі вырас. Адных студэнтаў у ім налічваецца больш 15 тысяч. А які цудоўны корпус хімікам пабудавалі! Каб толькі яго абыйсці, трэба шмат часу патраціць. Дык ты збірайся, Дзед Мароз, і вазьмі з сабой у дарогу каго-небудзь з памочнікаў. Ды глядзі, назірай за ўсім пільна і ўважліва...

І вось ясным марозным ранкам, апрануўшыся ў адзенне радавога дацэнта, Дзед Мароз рушыў у дарогу. Пачаць свой перадНавагодні рэйд ён вырашыў з гуманітарнага корпуса, што знаходзіцца на вуліцы Чырвонаармейскай. Ідзе Дзед Мароз па вуліцы Кірава, любуецца зімовым убраннем. Раптам бачыць: шыбуе насустрач яму знаёмая постаць. І хто б вы думалі? Даніла Шыла! Вядомы сатырык і гумарыст, які часта заглядаў некалі ў газету «Беларускі універсітэт» і выдаваў такія салёныя фельетоны.

— Здароў, Даніла! Куды шлях трымаеш?

— А нікуды асабліва. Ёсь вырашыў прайсціся па роднаму гораду, паглядзець, як ён рыхтуецца да Новага года.

— Ну, дык добра. Ты якраз мне патрэбен. Даўно не быў ва універсітэце?

— А што? Праўду ты кажаш. Давай разам пойдзем.

Прыходзяць яны ў гуманітарны корпус, дзе займаюцца філолагі і журналісты. Падымаюцца па лесвіцы на другі паверх. Ідуць заняткі, а на калідоры народу, што на тым кірмашы. Снуюць туды-сюды, гармідар паднялі. Цэлымі групамі збіраюцца.

— Дзіўна, чаму яны не на лекцыях? — пытае Даніла Шыла.

— А гэта ў іх так заняткі праходзяць. Аўдыторый не хапае, дык яны вось тут, на калідоры, вымушаны займацца, — адказвае Дзед Мароз. — Вунь там у кутку ідуць заняткі дыялекталагічнага гуртка, а там, ля акна, праводзіць пасяджэнне кафедры прафесар М. Г. Булахаў. А з гэтымі студэнтамі, што стаяць ля стэнда, праводзіць кансультацыю прафесар А. Я. Супрун.

— А няўжо рэктарат не ведае пра такое становішча?

— Ведае і пэўныя захады прымае, але пакуль што «воз і дагэтуль там». Ёсць, напрыклад, прапанова перавесці факультэт журналістыкі ў памяшканне інтэрната, дзе жывуць студэнты педінстытута, але дзесьці супраць гэтага.

— Дзесьці? Ага, зразумела. А як жа жывуць журналісты?

— Пойдзем, паглядзім.

Заходзяць яны ў кабінет друку, у якім размешчаны адразу тры кафедры. Тры лабаранткі перабіраюць пальцамі на трох машынках, тры выкладчыкі вядуць размову з трыма студэнтамі (напэўна, залікі прымаюць) і тры студэнты чакаюць сваёй чаргі, перагортваючы падшыўкі газет за тры гады, складзеныя вялікай кіпай на стале ў кутку.

— Нічога сабе, творчая абстаноўка, — зазначыў Даніла Шыла.

— Будзем спадзявацца, што на новым месцы, у былым корпусе хімфака, будуць лепшыя ўмовы для працы.

Пагадзіўшыся на гэтым, сябры задумалі паглядзець, як жывуць студэнты ў інтэрнаце.

І вось крочаць яны па вуліцы. Даходзяць да ГУМа. Раптам Дзед Мароз спыніўся і звярнуўся да Данілы:

— Ты пачакай, я хутка вярнуся.

Праз хвілін колькі Дзед Мароз, узбуджаны, выбягае з магазіна, трымаючы ў руках два пластмасавыя мотацыклетныя шлемы.

— Навошта табе гэтыя даспехі? — здзівіўся Даніла Шыла.

— Без гэтага, браток, небяспечна ісці ў інтэрнат. Там з акон вельмі часта вылятаюць цяжкія прадметы—бутэлькі, шклянкі, бляшанкі з-пад кансерваў — і прама на галаву. Нават у некаторыя пакоі небяспечна заходзіць. Вось нядаўна студэнт Русакевіч зайшоў без каскі да свайго сябра студэнта Шырко, а той яму так пляснуў бутэлькай па галаве, што прыйшлося хуткую дапамогу выклікаць.

Надзеўшы шлемы, яны рушылі далей, па Паркавай магістралі.

Прыходзяць у інтэрнат. Дзяжурны нават не спытаў, хто яны і адкуль. «Напэўна, ўдзельнікі мотакросу», — падумаў.

— Зойдзем да хлопцаў-філолагаў.

*(Заканчэнне на 4-й стар).*



БЕЛЫМ СНЕГАМ ЗАМЯЛО...

Фотаэцюд Б. Гарноські.

# СПАБОРНІЧАЮЦЬ ТАЛЕНТЫ

У пераднавагоднія дні універсітэцкія самадзейныя артысты паказалі сваё мастацтва на раённым аглядзе мастацкай самадзейнасці.

Універсітэт прадстаўлялі ў асноўным філолагі, журналісты, юрысты і матэматыкі. Адразу ж трэба агаварыцца, што агульнауніверсітэцкія калектывы, за выключэннем эстраднага ансамбля, у гэтым творчым спаборніцтве не ўдзельнічалі. Аркестр народных інструментаў, народная харавая капэла і народны ансамбль танца «Крыжачок» будуць выступаць на спаборніцтвах народных калектываў г. Мінска. Таму ўся адказнасць за поспех раённых выступленняў лягла на факультэцкую самадзейнасць. З гонарам вытрымалі гэты пазасесійны экзамен студэнты-філолагі, якія прадставілі на агляд удалую літаратурна-музычную кампазіцыю, дуэт, сола на дудцы і некалькі выдатных дэкламатараў. Нешматлікі факультэт журналістыкі падрыхтаваў інструментальны ансамбль і чатырох дэкламатараў, прычым два з іх прайшлі на гарадскі агляд. Добра паказалі сябе юрысты: дуэт Елісеенка—Шутовіч, салістка Ларыса Чапурко і іншыя.

Ад матэматычнага факультэта выступілі дэкламатары і сола на баяне. Цудоўны майстар гэтага інструмента Барыс Іваноў будзе ўдзельнічаць у гарадскім аглядзе.

Алег Ерашэнка і Людміла Андрэйчанка асобна прадстаўлялі фізічны і гістарычны факультэты. Астатнія факультэты з-за нізкага ўзроўню мастацкай самадзейнасці зусім не былі прадстаўлены.

А вось інструментальны ансамбль універсітэта пад кіраўніцтвам Юрыя Папова выступіў выдатна. Цудоўнае гучанне гітарнага складу ўдала дапаўнялася добрымі вакальнымі данымі салістаў Жака Амадзі і Лілі Цяцерынай, Джона Флетчара і дуэта Э. Якубоўскай і Л. Ясінскай.

Аўтарытэтнаму журы цяжка было вырашыць, каго паслаць на гарадскі агляд, таму што ад адной арганізацыі можна было адабраць не больш пяці нумароў. У выніку ўсебаковага абмеркавання вызначыліся ўдзельнікі гарадскога агляду. Гонар універсітэта будуць абараняць інструментальны ансамбль, дэкламатары Леанід Нарэйка і Наташа Кочкар (журфак), Тамара Пятрэнка (філфак), баяніст Барыс Іваноў і сола на дудцы Святлана Татур, салістка Ларыса Чапурко і дуэт Э. Якубоўская і Л. Ясінская.

Нельга не папракнуць факультэцкія грамадскія арганізацыі, якія даволі абыякава (за выключэннем, праўда, філалагічнага і факультэта журналістыкі) аднесліся да агляду. І ў той жа час асабліва многа цёплых слоў хочацца выказаць у адрас адказнай за культурна-масавую работу ў партбюро філфака Маргарыты Барысаўны Яфімавай і намесніка дэкана журфака Аляксея Ільіча Раковіча, якія аддалі максімум увагі адказным выступленням студэнцкай мастацкай самадзейнасці.

Наступным этапам з'яўляецца гарадскі агляд.

**В. ЛІТВІНКА,**
старшыня праўлення
студэнцкага клуба універсітэта.



# ПА ПЛАНЕЦЕ КРОЧЫЦЬ НОВЫ ГОД

*(Заканчэнне. Пачатак на 2-й стар.).*

Істотных адрозненняў няма.

Ліванскі студэнт матфака Антуан Амідзі расказаў, што у Ліване, дзе ёсць пакрытыя снегам горы, расце сапраўдная ёлка. Яе і ўпрыгожваюць на Новы год у сем'ях. Розніца толькі ў тым, што ў грамадскіх месцах ёлку не ставяць: ліванцы лічаць Новы год святам вузка сямейным. Тлумачыцца гэта укладам іх жыцця. Студэнты таксама сустракаюць Новы год у сем'ях. На святочным стале абавязкова павінна быць віно (лічыцца, лепш, калі шампанскае), арэхі, сыр і іншыя закускі.

Перад Новым годам на хімічны факультэт нашага універсітэта на стажыроўку прыехаў арабскі аспірант МДУ імя М. В. Ламаносава Самір Ахмед Абдэль Халім Абу Алі.

— Мае землякі ў Аб'яднанай Арабскай Рэспубліцы,— сказаў ён, — адзначаюць Новы год прыкладна, як і ў вас. Толькі ёлкі прывозяць з-за мяжы і ставяць іх у грамадскіх месцах, упрыгожваюць, як і ў еўрапейскіх краінах. Але Дзед Мароз са Снягурачкай не трапляюць на свята з падарункамі, бо гэта было б нехарактэрна для Егіпта з яго цёплым кліматам.

В'етнамцы адзначаюць Новы год звычайна два разы. Першы раз разам з усімі людзьмі планеты — 1 студзеня, а затым Лунны год. Найбольш маляўніча і цікава праходзіць Лунны год, які будуць сустракаць на гэты раз 15 лютага. Лунны год — урачыстае традыцыйнае свята.

— У кожным доме, — расказвае студэнтка падрыхтоўчага факультэта Ву Тхі Х'еп, — ставяцца вазы з ружовымі кветкамі персіка, а замест ёлкі—мандарынавае дрэва. У сельскай мясцовасці людзі на вуліцах раскладваюць кастры, садзяцца вакол іх і расказваюць казкі, цікавыя гісторыі.

Як расказалі кубінскія студэнты, у іх на радзіме на вуліцах і плошчах праводзяцца карнавалы, маскарады. Новы год тут амаль супадае з другім нацыянальным святам — Днём Рэспублікі.

У Іране, як і ў В'етнаме, запальваюць навагоднія кастры.

У кожнага народа свае традыцыі, звычаі, рытуалы. Ёсць адрозненні, ёсць агульнае. Але з кім з замежных студэнтаў ні даводзілася гутарыць, ім падабаецца наша беларуская зіма з яе снегам і марозам, з вечназялёнай ёлкай, на якой апоўначы ўспыхваюць агні, з Дзедам Марозам і Снягурачкай, што раз'язджаюць на тройцы коней і прыносяць да нас на свята падарункі.

Замежныя сябры горача віншуюць нас з Новым годам, з новым шчасцем.

**У. ГАЛАЙША.**



Нядаўна гасцямі студэнтаў БДУ былі ўдзельнікі малдаўскага эстраднага ансамбля «Норок».
НА ЗДЫМКУ: спявае саліст ансамбля Владко Іскраў. Фота В. Дзешкаўца і А. Ласмінскага.

# НАВАГОДНІ РЭЙД ДЗЕДА МАРОЗА

*(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.).*

Зайшлі ў 293 пакой і бачаць: на стале бутэлькі, недаедзеныя кавалкі каўбасы, а на падлозе смецце, якое, можа, з тыдзень збіралася.

— Што ж, паглядзім, можа журналісты больш акуратныя?

Зайшлі ў пакой 159, дзе жывуць Сярэдзіч, Ваяводскі, Зянкевіч, Русаковіч, Кудраўцаў. І тут той жа парадак, хоць на падлозе пасцелен лінолеум, які жыхары пакоя «пазычылі» на студэнцкай кухні.

— Можа зойдзем да дзяўчат, яны, напэўна, сочаць за парадкам лепей?— выказаў прапанову Даніла Шыла і хацеў было пастукаць у 141 пакой, але раптам Дзед Мароз схапіў яго за рукаў:

— Не трэба сюды заходзіць. Тут цябе так гасцінна сустрэнуць, што нават і шлемы не дапамогуць: аблаюць такімі брыдкімі словамі, што хоць вушы затыкай.

— Ну, дык давай спусцімся ніжэй.

Нарэшце сябры зайшлі ў 47 пакой, дзе жывуць студэнткі Прыснякова, Пракопчык, Пецелька, Майкова, Гаўрыленка, Гайкова. Уздыхнулі з палёгкай. Чыста, утульна, ложкі акуратна прыбраны.

Пасядзелі Дзед Мароз і Даніла Шыла ва ўтульным пакоі, адпачылі крыху і пашыбавалі далей, у напрамку галоўнага корпуса.

Неўзабаве яны ўжо ўваходзілі ў вестыбюль.

— Халаднавата нешта, — адзначыў Дзед Мароз, — нават я адчуваю гэта.

— Так, адразу відаць, што зіма на вуліцы.

Ідуць яны па калідоры першага паверха і бачаць: стаіць вялікая чарга. Многія чытаюць кнігі, газеты, а адна жанчына нават вязанне з сабой прыхапіла. Сярод тых, хто цярпліва стаяў у чарзе, Даніла Шыла пазнаў вядомых яму прафесараў і дацэнтаў, выкладчыкаў і аспірантаў.

— А куды гэта чарга?

— Зарплату атрымаць хочуць,—пачуў Дзед Мароз. —Бачыш, якая чарада. Цяпер жа ва універсітэце больш як паўтары тысячы выкладчыкаў.

— А чаму так марудна чарга рухаецца?

— А ты паглядзі наперад. Бачыш натоўп маладых людзей. Гэта супрацоўнікі праблемных лабараторый. Пакуль усе не пройдуць, чарга — ні з месца. Нават калі ў ёй дваццаць акадэмікаў стаяць будзе.

— А ці нельга змяніць такі парадак?

Дзед Мароз усміхнуўся, і яны пайшлі далей. На трэцім паверсе — шмат розных аб'яў. Па ўсім відаць, што надыходзіць сесія. Тут запрашэнні на канцэрты, у турысцкія паходы. Вялікімі літарамі напісана: «Увага, пачынаецца новы заезд у прафілакторый. Заявы і санаторныя карткі падавайце ў прафком». Матэматыкі выпусцілі новыя насценгазеты, «КП», у якім галоўнае месца займаюць актуальныя передсвяточныя праблемы: куды хаваць і куды здаваць парожнія бутэлькі з-пад безалкагольных напіткаў...

Ідуць яны далей, да корпуса радыёфізікі, і тут ужо сапраўды пачынаюць заўважаць прыкметы надыходзячай сесіі. На стэндзе вісіць даўжэзны спіс з 250 прозвішчамі студэнтаў, якія яшчэ з верасня ўзялі ў бібліятэцы кнігі і ніяк не могуць з імі разлучыцца.

Сябры вырашылі зайсці на якую-небудзь кафедру, паглядзець, як займаюцца навукай студэнты. Пастукалі ў адны дзверы—зачынена, у другія — зачынена.

Нарэшце, убачыўшы на дзвярах кафедры ядзернай фізікі суровае папярэджанне: «Без справы не заходзіць!», рашылі, што рабіць ім тут нечага, і накіраваліся да новага корпуса хімічнага факультэта.

Прыгожы, высокі, светлашэрага колеру будынак красаваўся на фоне блакітнага неба.

— Высока трэба падымацца некаму, — зазначыў Даніла Шыла, падлічыўшы позіркам восем паверхаў гмаху.

— Нічога, ліфт імчыць хутка.

Заходзяць у вестыбюль. Усюды прасторна, светла. Вось і ліфт. Даніла Шыла націскае кнопку, адну, другую, трэцюю... Але ліфт ні з месца.

— Што за праява? — кажа Дзед Мароз.

Тут яны агледзеліся і ўбачылі, што па лесвіцы падымаюцца адзін за адным студэнты і выкладчыкі, несучы з сабою розныя прыборы, скрыні, шклянкі. Следам за імі пайшлі і нашы падарожнікі. Узняліся на трэці паверх, на чацвёрты. Дзед Мароз пачаў адставаць.

— Трымайся, дзядуля, — падбадзёрыў Даніла.—Хутка ўжо дабярэмся да біёлагаў.

Дайшоўшы да пятага паверха, яны ўбачылі на лесвічнай пляцоўцы сівога прафесара, які стаяў, прытуліўшыся да сцяны і цяжка пыхаючы, выціраў хусцінкай успацелы лоб.

— Нялёгкая дарога, — зазначыў Даніла Шыла. — Так можна і на лекцыю спазніцца.

— Ёсць ужо некалькі тыдняў пехатою ўзбіраемся на восьмы паверх,—растлумачыў прафесар. — Кажуць, ліфт нейкай замежнай маркі, да яго асаблівы падыход патрэбен.

Дабраліся Дзед Мароз і Даніла Шыла на восьмы паверх, пачалі любавацца адтуль панарамай передсвяточнага горада. Але Дзед Мароз паглядзеў на гадзіннік:

— Ну, што ж, на сённяшні дзень хопіць уражанняў. Бачу, што Новы год без работы не застанецца. І табе, Даніла, раю часцей наведваць універсітэт, каб дапамагчы ліквідаваць недахопы.

Яны спусціліся ўніз, развіталіся і пайшлі кожны сваёй дарогай: Дзед Мароз—пісаць наказ Новаму году, а Даніла Шыла — у рэдакцыю газеты «Беларускі універсітэт».

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА

АТ 10410. Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Т-22-07-19. Друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Тыраж 2000 экз. Зак. 2132.